# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 4 (826) | Аўторак, 11 лютага 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

## САЮЗ МОЛАДЗІ ЦІ СТУДЭНЦКІ САЮЗ?

### На агульнауніверсітэцкай студэнцкай канферэнцыі

### выбар зрабілі на першым

Пасля вядомых мінулагодніх жнівеньскіх падзей ва ўсіх сферах жыцця нашага грамадства адбыліся карэнныя змены. Закранулі яны і дзейнасць ВЛКСМ. XXII з'езд камсамола краіны (цяпер ужо былой) прыняў рашэнне аб завяршэнні палітычнай ролі ВЛКСМ як федэрацыі камуністычных саюзаў моладзі. Перад юнакамі і дзяўчатамі паўстала пытанне: а што ўзамен? Стала відавочным, што неабходна новая маладзёжная арганізацыя.

У нашым універсітэце, у прыватнасці, у канцы верасня мінулага года адбылася нечарговая камсамольская канферэнцыя, на якой яе дэлегатам таксама трэба было вызначыць, ці застаецца ў ГДУ Саюз Моладзі Беларусі, ці камсамольскай арганізацыі універсітэта ўступіць калектыўным членам у Студэнцкі саюз — незалежную грамадскую арганізацыю, аб'ядноўваючую ў сваіх радах студэнтаў, аспірантаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення. Але з-за недахопу кворуму канкрэтнага рашэння тады прынята не было.

Час ішоў, і моладзі трэба было ўсё ж зрабіць свой выбар. Таму з гэтай мэтай 27 студзеня адбылася агульнауніверсітэцкая студэнцкая канферэнцыя. На яе былі выбраны 123 дэлегаты ад усіх факультэтаў, з'явіліся — 73. У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел рэктар ГДУ Л. А. Шамяткоў, прарэктары: па вучэбнай рабоце — М. В. Селькін, па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях — А. П. Кармазін, дэканы факультэтаў, першы сакратар абласной арганізацыі Саюза Моладзі Беларусі Віктар Дзенісенка.

Па прапанове студэнтаў было вырашана выбраць у прэзідыум прадстаўнікоў ад трох грамадскіх арганізацый ГДУ: ад Саюза моладзі — старшыню рэвізійнай камісіі абласной арганізацыі СМБ Міхаіла Жукевіча, ад Саюза студэнтаў — Пятра Асіненку, студэнцкага прафсаюза — Н. І. Колтышаву.

Аб задачах і перспектывах развіцця грамадскага руху ў нашай вобласці, у рэспубліцы дэлегатам канферэнцыі расказаў В. Дзенісенка. У сваім выступленні ён падкрэсліў, што Саюз моладзі з'яўляецца правапрыемнікам камсамола Беларусі, і яму пераходзіць уся яго маёмасць. Яму было зададзена нямала пытанняў аб маладзёжным руху вобласці, у прыватнасці, на яе буйных прадпрыемствах.

У выступленнях студэнтаў Г. Фядосенкі, А. Дабрасельскага, І. Браталюбавай і іншых дэлегатаў галоўнай была наступная думка: членства ў Саюзе студэнтаў можа працягвацца толькі пяць гадоў вучобы ў ГДУ. Таму лепш уступаць у такую арганізацыю, якая давала б магчымасць моладзі прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і пасля заканчэння універсітэта, у час сваёй працоўнай дзейнасці. Студэнты хацелі б атрымліваць у такой арганізацыі дапамогу і ва ўладкаванні на часовую работу ў вольны ад вучобы час, разнастайныя юрыдычныя кансультацыі, магчымасць падзарабіць грошай летам, у час канікулаў, нават у суседніх замежных краінах. Трэцякурснік геалагічнага факультэта Ю. Сувіга выступіў з прапановай пакінуць ва універсітэце толькі адну грамадскую арганізацыю, якая б абараняла інтарэсы моладзі — прафком студэнтаў.

Некалькі гадоў назад камсамольскую арганізацыю ГДУ ўзначальваў Алег Дземідзенка. І яму, цяпер ўжо асістэнту кафедры АСАІ, неабыякава, на якой грамадскай арганізацыі спыняць свой выбар сённяшнія студэнты. Ён гаварыў аб развіцці маладзёжнага руху ў рэспубліцы, аб пераемнасці яго развіцця ў нашым універсітэце.

Аб дапамозе, якая аказваецца моладзі такой грамадскай арганізацыяй як прафком студэнтаў, яго рабоце з савецкімі арганізацыямі горада праз запыты дэпутатаў расказала на канферэнцыі Н. Колтышава.

У сваім выступленні рэктар Л. А. Шамяткоў падкрэсліў думку аб тым, што адміністрацыя ГДУ ніколі не навязвала сваю волю студэнцтву, прыслухоўвалася да ўсіх прапаноў і былога камітэта ЛКСМБ, і Саюза студэнтаў, прафкома студэнтаў, а таксама выбраных у састаў савета універсітэта юнакоў і дзяўчат, і права кожнага студэнта — зрабіць свой выбар, членам якой з трох грамадскіх арганізацый ГДУ яму стаць.

С. Дашкевіч, які, па-сутнасці, аднachасова займаў дзве пасады—сакратара Саюза моладзі і старшыні Саюза студэнтаў універсітэта, расказаў дэлегатам аб фінансавым становішчы гэтых арганізацый, назваў колькасць іх членаў, і, як кажуць, паставіў пытанне рубам: вырашайце, што вы выбіраеце, і папрасіў зняць з яго паўнамоцтвы сакратара Саюза моладзі. Яго адстаўка была прынята.

Галасаванне паставіла ўсё кропкі над «і». 12 дэлегатаў канферэнцыі выказаліся супраць Саюза моладзі, 4 — устрымаліся. Такім чынам, большасць галасоў дэлегатаў канферэнцыі аддадзена за Саюз моладзі. На пасаду яго сакратара на канферэнцыі была прапанавана кандыдатура выпускніка фізічнага факультэта **Віктара ЛЕВАНЦОВА**, які працуе ва універсітэце. Было вырашана пасля вяртання студэнтаў з зімовых канікулаў правесці на факультэтах сходы і выбраць па аднаму прадстаўніку ў састаў камітэта Саюза моладзі.

**(Наш кар.)**

*Афіцыйны аддзел*

## ВУЧОНЫ САВЕТ ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ

На пасяджэнні вучонага савета універсітэта, якое адбылося 30 студзеня г. г., вырашана:

1. Пачынаючы з 1992/93 навучальнага года ў якасці асноўных курсаў на ўсіх спецыяльнасцях ажыццяўляць выкладанне наступных вучэбных дысцыплін:

а) гісторыя Беларусі — 1 і 2 семестры ў аб'ёме 84 вучэбныя гадзіны (на эканамічным факультэце па ўзгадненню з факультэтам);

б) філасофія — 3 і 4 семестры ў аб'ёме 84 вучэбныя гадзіны (на эканамічным факультэце — 5 і 6 семестры);

в) эканамічныя тэорыі — 5 і 6 семестры ў аб'ёме 84 вучэбныя гадзіны (на эканамічным факультэце 1 і 2 семестры ў аб'ёме 120 вучэбных гадзін);

г) паліталогія — 7 або 8 семестр у аб'ёме 54 вучэбныя гадзіны;

д) на спецыяльнасці «Гісторыя» выкладанне дысцыплін: гісторыя Беларусі, філасофія, эканамічныя тэорыі, паліталогія ажыццяўляецца ў адпаведнасці з вучэбным планам.

Па кожнай з названых дысцыплін устанавіць адзіную форму справаздачнасці — у кожным семестры залік.

2. Устанавіць, што ў 7 або 8 семестрах у вучэбных планах спецыяльнасцей выдзяляецца не менш 54 вучэбных гадзін на выкладанне абавязковых курсаў на выбар па дысцыплінах грамадска-гуманітарнага цыклу (форма справаздачнасці — не больш 2-х залікаў).

Па ўзгадненню з вучонымі саветамі факультэтаў кафедрамі грамадска-гуманітарнага цыклу можа ажыццяўляцца выкладанне факультатыўных курсаў. Месца гэтых курсаў у вучэбным плане данай спецыяльнасці, колькасць гадзін, праграмы вызначаюцца і зацвярджаюцца вучонымі саветамі тых факультэтаў, дзе гэтыя курсы чытаюцца.

3. Закрыць наступныя кафедры:

палітычнай гісторыі XX ст.; гісторыі СССР і БССР; палітычнай эканоміі; этыкі, эстэтыкі і гісторыі культуры.

4. Адкрыць наступныя кафедры:

**на гістарычным факультэце: гісторыі Беларусі, гісторыі ўсходнеславянскіх народаў;**

**на эканамічным факультэце: эканамічных тэорый;**

**на філалагічным факультэце: культуралогіі.**

Кафедры філасофіі і палітычнай сацыялогіі ўключыць у склад гістарычнага факультэта, кафедру фізічнага выхавання — факультэта фізічнай культуры.

5. Рабочыя праграмы асноўных курсаў, пералічаных у пункце 1, курсаў па выбару і факультатываў штогод, да 1 красавіка, зацвярджаюцца вучонымі саветамі тых факультэтаў, дзе гэтыя курсы чытаюцца, а таксама тых факультэтаў, за якімі замацаваны адпаведныя кафедры.

6. Для вырашэння бягучых пытанняў па арганізацыі гуманітарнай адукацыі ва універсітэце стварыць камісію па гуманітарнай адукацыі ў наступным саставе:

Воінаў М. М., прарэктар універсітэта (старшыня), загадчыкі кафедр: гісторыі Беларусі, філасофіі, эканамічных тэорый, культуралогіі, палітычнай сацыялогіі, па аднаму прадстаўніку ад кожнага факультэта.

Аднachасова скасаваць савет па сацыяльна-гуманітарнай адукацыі.

7. Аддзелу кадраў, вучэбнаму аддзелу да 20 лютага ажыццявіць разлік штатнага раскладу і аб'ёму вучэбных даручэнняў па кожнай з новых кафедр.

## УДАКЛАДНЕННЕ МІНІСТЭРСТВА

У газеце «Гомельскі універсітэт» за 24 студзеня г. г. быў змешчаны матэрыял пад загалоўкам «Як нам выжыць?» У ім начальнік планава-фінансавага аддзела ГДУ С. Я. Пашук гаварыла аб павышаных пасадавых акладах і стаўках для работнікаў вышэйшай школы. Разам з тым указвалася, што асобам, якія маюць ганаровае званне «народны», аклад павышаецца на 200 руб., «заслужаны» — на 160 руб. Пасля гэтай публікацыі, як паведаміла Святлана Яўгенаўна, з Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прыйшло ўдакладненне: за названыя ганаровыя званні дабаўка да пасадавага акладу вызначана адпаведна ў суме 100 і 80 руб.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры дыфураўненняў БАРЫСА Якава Сяргеевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.**

**30** СТУДЗЕНЯ на пасяджэнні вучонага савета

**ВЫБРАНЫ НА ВАКАНТНЫЯ ПАСАДЫ:**

**АФАНАСЬЕЎ Іван Мікалаевіч** — старшым выкладчыкам кафедры рускай літаратуры;

**ЮФЕ Леў Аркадзьевіч** — дацэнтам кафедры ЭІ і АСК;

**ШОЛАХ Валянціна Рыгораўна** — дацэнтам кафедры оптыкі;

**БОБРЫК Уладзімір Ільіч** — дацэнтам кафедры палітэканоміі;

**ДАЎГЯЛА Галіна Аляксандраўна** — загадчыцай кафедры рускай мовы для замежных навучэнцаў;

**ПЕРЦАВЫ Леанід Іванавіч** — дацэнтам кафедры палітэканоміі;

**ВЕРАМЕЙЧЫК Васіль Яўстратавіч** — дацэнтам кафедры батанікі і фізіялогіі раслін;

**ЕЎТУХОЎ Уладзімір Дзмітрыевіч** — дэканам філалагічнага факультэта.

